*Свяпьiана Гуткоўская*
*Мiхаiл Камiнскi*

**ВЫКАРЫСТАННЕ «МЕТАДУ ПРАЕКТАЎ» ПРЫ РАБОЦЕ НАД МАСТАЦКАЙ АПРАЦОЎКАЙ ФАЛЬКЛОРУ**

Захаванне традыцый беларускага танцавальнага фальклору, арганічнае ўключэнне іх у інавацыйную сістэму вышэйшай харэаграфічнай адукацыі з'яўляецца адной з найважнейшых практычных і тэарэтычных задач педагагічнага калектыву кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

Асноўным педагагічным інструментам на кафедры харэаграфіі для забяспячэння вышэйазначанай задачы абраны «метад праектаў» як найбольш аптымальны сродак «павышэння студэнцкай гатоўнасці мэтазгодна дзейнічаць у адпаведнасці з патрабаваннямі справы, метадычна вырашаць задачы і праблемы, а таксама самаацэньваць вынікі ўласнай дзейнасці» [4].

Рэалізацыя творчых праектаў істотна абнаўляе змест адукацыйных модуляў спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва» і мае рашаючае значэнне пры рабоце з фальклорнымі першакрыніцамі.

**Мэтай артыкула** з'яўляецца абгрунтаванне канцэпцыі выкарыстання метаду праектаў пры працы з нацыянальнай фальклорнай спадчынай ва ўмовах прафесійнай падрыхтоўкі харэографа ў вышэйшай школе і прадстаўленне алгарытму яго практычнай рэалізацыі.

Метад праектаў у дачыненні да працэса навучання харэографаў - гэта сукупнасць прыёмаў і дзеянняў студэнтаў у вызначанай паслядоўнасці з мэтай дасягнення пастаўленай творчай задачы у выглядзе канчатковага мастацкага прадукта. Адпаведна з навучальнай праграмай па дысцыпліне «Мастацтва балетмайстра», выніковае заданне 5-га семестра прадугледжвае аднаўленне фальклорнай першакрыніцы і распрацоўку на яе аснове пашыранай формы. Выніковае задание 6-га семестра прадугледжвае распрацоўку харэаграфічнага твору вялікай формы «фальклорная вечарына», якая аб'ядноўвае папярэднія індывідуальныя студэнцкія праекты у цэласны сцэнічны твор, пабудаваны па законах драматургічнага мастацтва - адзінства часу і месца дзеяння, канфлікт, скразное дзеянне і звышзадача дзеючых асобаў, тэма і ідэя пастаноўкі.

Здзяйсненне праекта прадастаўляе студэнтам магчымасць творча-даследчай дзейнасці сумесна з выкладчыкамі шэрагу спецыяльных дысцыплін кафедры харэаграфіі: «Мастацтва балетмайстра», «Харэаграфічны ансамбль», «Класічны танец», «Народна-сцэнічны танец», «Аналіз музыкальных форм», «Рэжысура і майстэрства акцера», «Пантаміма».

Цэласны працэс творчай дзейнасці педагогаў і студэнтаў, звязаны з выкарыстаннем фальклору, згодна з метадам праектаў патрабуе захавання пэўных умоў і падзяляецца на некалькі ўзаемазвязаных этапаў.

**Першы этап (верасень-кастрычнік).** Аднаўленне фальклорнай першакрыніцы.

Студэнты працуюць над уласным праектам - праводзяць вывучэнне і аналіз матэрыялаў Галіновай навукова-даследчай лабараторыі беларускай танцавальнай творчасці з мэтай збору найбольш поўнай інфармацыі аб канкрэтных танцавальных фальклорных узорах. Аднаўляюць абраны твор.

Другі **этап (лістапад-снежань).** Пабудова пашыраннай формы фальклорнага ўзору.

На цякучым этапе харэограф пластычна «ажыўляе» пісьмова зафіксаваны узор, і, вылучыўшы асноўны пластычны матыў, кампазіцыйны фрагмент або яркі вобраз, развівае іх рознымі мастацкімі сродкамі. Арганізуе аднакурснікаў у якасці выканаўцаў сваёй задумы.

У залежнасці ад колькасці, ступені падрабязнасці інфармацыі, якую ўдалося сабраць, харэограф выбірае спосаб інтэрпрэтацыі ўзораў народнай танцавальнай творчасці. Пры гэтым ён арыентуецца на вядомыя ў мастацтвазнаўстве прынцыпы сцэнічнай апрацоўкі фальклору [1, с. 12-13].

Пры ажыццяўленні пастановачнага працэсу выяўляецца дваісты характар магчымасцей, дадзеных балетмайстру. З аднаго боку, яму неабходна прытрымлівацца традыцыйнай падачы матэрыялу на аснове навуковых ведаў у пэўнай галіне, а з другога, ен можа карыстацца адноснай свабодай творчага выбару пры пастаноўцы танца (што азначае ўвасабленне набытых уменняў і навыкаў у арыгінальныя формы, стварэнне новых варыянтаў, арыгінальных трактовак вядомых узораў.

**Трэцці этап (люты-сакавік).** Падрыхтоўка агульнага сцэнарнага плана фальклорнай вечарыны.

У рамках агульнакурсавога праекта аб'яўляецца конкурс на лепшы сцэнарый фальклорнай вечарыны. Гэта спрыяе павышэнню узроўня мастацкага мыслення і абагульнення творчых ідэй, і выступае як фактар узмацнення прафесійнай і навучальнай матывацыі студэнтаў.

**Чацверты этап (сакавік).** Конкурс сцэнарыяў. Абмеркаванне і дапрацоўка.

Удзельнікі праекта - студэнты і педагагічная група - абмяркоўваюць сцэнарыі, і выбіраюць найбольш цікавы з мастацкага і пастановачнага пункту гледжання. Выкладчык дысцыпліны «Мастацтва балетмайстра» мае пераважнае права рэкамендаваць лепшы на яго думку сцэнарый альбо прапаноўваць кампіляцыю з разнастайных ідэй студэнтаў.

**Пяты этап (сакавік).** Пабудова плана і графіка пастановачных мерапрыемстваў. Размеркаванне роляў.

Пасля зацвярджэння сцэнарыя паміж членамі студэнцкага калектыва размяркоўваюцца ролі выканаўцаў. харэографаў, адказных за пастаноўку пэўнага эпізода, прадстаўнікоў тэхічнай і адміністратыўнай службы. Тэхнічная служба адказвае за светлавое і музычнае вядзенне спектакля, работу з мультымедыйнай тэхнікай - відэапраектарам. Абавязкі па перастаноўцы дэкарацый, падрыхтоўка рэквізіту да нумару, работа касцюмера - размяркоўваецца паміж выканаўцамі харэаграфічных кампазіцый. Адміністратыўная группа праводзіць папярэднюю камп'ютарную распрацоўку запрашальнага білета і афішы фальклорнай вечарыны.

**Шосты этап (сакавік).** Падрыхтоўчы перыяд (падбор ці выраб рэквізіту, дэкарацый, касцюмаў, ажыццяўленне аўдыа і відэа мантажу, рэпетыцыонная работа).

Завершаючым этапам працы пастаноўшчыка над уласнай кампазіцыяй з'яўляецца практычнае ўвасабленне задумы будучага танцавальнага нумара, канчаткова сфармаванага у выніку вызначэння яго месца і значэння ў агульным сцэнары.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На гэтым этапе відавочна праяўляецца складанасць адаптацыі фальклора традыцыям прафесійнага сцэнічнага мастацтва. Гэта назіраецца ў спробах перайначыць манатонныя элементы першакрыніцы адпаведна патрабаванням відовішчнасці, калі есць прадчуванне што абрадавая каштоўнасць не будзе успрынятая пры дэманстрацыі сучаснаму гарадскому гледачу. [3, с.24].

Паралельна праводзіцца пошук і апрацоўка музычнага матэрыяла фальклорнай першакрыніцы, кантроль за аранжыроўкай для ансамбля народных інструментаў. У якасці дадатковага выразнага сродка студэнтам прапануецца выкарыстанне відэапраекцыі да сваей пастаноўкі. Харэограф распрацоўвае канцэпцыю спалучэння відэарада са сцэнічным увасабленнем нумара, арганізоўвае дзень, месца і удзельнікаў здымак, кантралюе правядзенне здымак і камп'ютарны відэамантаж.

**Семы этап (красавік-май).** Пастановачны перыяд.

Рэпетыцыі асобных харэаграфічных кампазіцый і інтэрмедыйных спосабаў пераходу між нумарамі; рэпетыцыі, на якіх выяўляюцца спосабы узаемадзеяння танцораў і відэапраекцыі. Тэхнічныя прагоны - выстаўленне асвятлення і зладжанасць перастаноўкі дэкарацый. Агульныя прагоны.

**Восьмы этап (чэрвень).** Публічны паказ.

Арганізацыя студэнтаў другога курса народнага аддзялення для работы з гледачом. Правядзенне паказу. Пад час паказу адбываецца абавязковая відэа- і фотаздымка.

Важна падкрэсліць, што рэалізацыя метаду праектаў на практыцы вядзе да змены традыцыйнай пазіцыі педагога. З носьбіта гатовых ведаў ён ператвараецца ў арганізатара даследчай дзейнасці сваіх вучняў [2]. У нашым выпадку выкладчык выступае ў ролі эксперта і кансультанта ў ажыццяўленні студэнтамі творчай дзейнасці.

Праца са студэнтамі вядзецца ў індывідуальным парадку. Шляхам ўскосных пытанняў ўдакладняецца ідэя пастаноўкі, разглядаюцца некалькі варыянтаў сцэнічнага ўвасаблення, рэкамендуюцца канкрэтныя літаратурныя крыніцы. Канчатковы выбар заўсёды застаецца за студэнтам.

У атмасферы сумеснанага ўзгодненага ўзаемадзеяння студэнтаў і выкладчыкаў прадугледжваецца абмен прадуктамі дзейнасці, інфармацыяй і ведамі, што забяспечвае ўзнікненне адносін адказнай залежнасці і ўзаемакантролю, павышае матывацыю навучання, фарміруе калектывіцкія ўзаемаадносіны.

У працэсе здзяйснення праекта па стварэнню фальклорнай вечарыны студэнты авалодваюць крэатыўнымі ўменнямі ў наступных відах дзейнасці: навукова-даследчай, сцэнарнай (распрацоўка сцэнарнага плана харэафафічнай кампазіцыі ці спектакля), рэжысёрска-пастановачнай, рэпетыцыйнай і выканальніцкай.

Дзякуючы прымяненню метаду праектаў студэнты-харэографы маюць магчымасць яшчэ ва універсітэце самастойна прайсці ўсе стадыі навукова-творчай працы з фальклорным матэрыялам - ад пошуку і выбару першакрыніцы да стварэння на яго аснове сучасных твораў сцэнічнага мастацтва.

Доследна-эксперыментальная работа на кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў паказала, што эфектыўнасць працэсу падрыхтоўкі спецыяліста залежыць ад некалькіх умоў. Гэта мэтанакіраванае мадэляванне навучальнага працэсу з улікам спецыфікі творчай дзейнасці, выпрацоўка агульнай мастацкай стратэгіі і тактыкі навучання і выхавання; арганізацыя заняткаў на аснове каардынацыі сумеснай дзейнасці студэнта, педагога і канцэртмайстра; інавацыйная падрыхтоўка студэнтаў да рэалізацыі творчых праектаў.

**Спіс літаратуры:**


1. Гуткоўская, С.В.. Хадзінская, Н.М. Стварэнне сйэнічнай кампазіцыі на аснове харэаграфічнага і музычнага фальклору: вучэб. дапам / С.В. Гуткоўская, Н.М. Хадзінская. - Мінск: Бел. ун-т культуры, 2000. - 56 с.
2. Соловьев, А.Н. Метод проектов в педагогике высшей школы: история и перспективы / А.Н. Соловьев, И.К. Степанян // Вестник МГУКИ. - 2009. - № 4. - С. 143-148.
3. Уральская. В.И. Природа танца / В.И. Уральская. - М.: Совет. Россия, 1981.
4. Юрова, Н.В. Основные направления развития профессиональной компетентности / Н.В. Юрова // Инновационные образовательные технологии. - 2010. - № 2. - С. 59-63.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ